*Л. А. Дзямешка,*
*кандыдат педагагічных навук*

# ДОСТУП ДА ІНФАРМАЦЫІ Ў БІБЛІЯТЭКАХ БЕЛАРУСІ: ГІСТАРЫЧНЫ АСПЕКТ І СУЧАСНАСЦЬ

Дастуннасць інфармацыі з'яўляецца адным з важнейшых складнікаў сучаснай цывілізацыі. Гэтая каштоўнасць адлюстравана ў заканадаўстве многіх краін, у тым ліку і Беларусі.

Важнейшым палажэннем Закона «Аб інфарматызацыі ў Рэспубліцы Беларусь» і Закона «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» з'яўляецца забеспячэнне аднаго з істотных канстытуцыйных правоў грамадзян – свабода доступу да інфармацыі, якая не ўяўляе дзяржаўнай ці камерцыйнай тайны. У значнай ступені гэта адносіцца да інфармацыйна-бібліятэчных рэсурсаў, якія прызнаны адкрытымі і агульнадаступнымі.

Прадастаўляючы права на інфармацыю, законы вызначылі юрыдычныя нормы абароны інфармацыі, што забяспечваецца дзяржаўнай рэгістрацыяй інфармацыйных рэсурсаў і сістэм, дзейнасцю службаў сертыфікацыі і ліцэнзавання, усталяваннем парадку аднясення інфармацыі да розных катэгорый доступу: адкрытая інфармацыя; інфармацыя, што ўтрымлівае дзяржаўную тайну; канфідэнцыяльная інфармацыя аб прыватным жыцці грамадзян і іншая, выкарыстанне якой не дазваляецца. У заканадаўстве адлюстравана рэальна існуючая супярэчнасць паміж неабходнасцю свабоднага доступу да інфармацыі і яе абаронай, абмежаваннем выкарыстання ў пэўных выпадках. Гэтая антыномія ўзнаўляецца на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва.

Высвятляецца праблема, звязаная з доступам да інфармацыі, – праблема яе каштоўнаснай ідэнтыфікацыі. Зыходзячы з каштоўнасных установак асобы, сацыяльнага інстытута, дзяржавы, адны кнігі, дакументы прызнаюцца карыснымі, другія – шкоднымі для карыстальніка. На гэтай падставе адны рэкламуюцца, свабодна прадастаўляюцца чытачам, другія – не дапускаюцца да выкарыстання.

Гісторыя ведае шмат прыкладаў абмежавання доступу да інфармацыі: спальванне «шкодных» кніг яшчэ да нашай эры кітайскім імператарам Цынь Шыхуандзі; знішчэнне кніг у Старажытным Рыме па распараджэнні Сената; выключэнне з манастырскіх бібліятэк твораў «ерэтыкоў», «чарнакніжнікаў»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«вальнадумцаў»; стварэнне пры бібліятэках Расіі сакрэтных аддзелаў для забароненых кніг і рукапісаў. Іх місію ў бібліятэках Беларусі ў XX ст. замянілі спецыяльныя сховішчы.

З другой паловы XIX ст. ганенню належалі кнігі «шкоднага сацыялістычнага вучэння», распаўсюджаныя ў нядзельных школах і народных чытальнях. Апошнія хутка былі зачыненыя асобым цыркулярам царскага ўрада. Цэнзура сачыла і за мараллю. Так, быў выключаны з хрэстаматыі для дзяцей верш А. Пушкіна «К няне» за радкі «Выпьем, добрая старушка, бедной юности моей» [2, с. 48].

За апалітычнасць бібліятэк, за свабоду выбару кніг для чытання, за распаўсюджанне і папулярызацыю ведаў па-за ідэалагічным зместам змагаліся прадстаўнікі дэмакратычнага кірунку, аб чым сведчыць дыскусія на I Усерасійскім з’ездзе па бібліятэчнай справе (1911) [1, с. 94].

У Беларусі свабодай выбару кніг для чытання некаторы час кіраваліся цэнтральныя бібліятэкі пры культурна-асветных аб’яднаннях: Гродзенскім педагагічным таварыстве, Слуцкім таварыстве адукацыі, Таварыстве Полацкай бібліятэкі, Віцебскім таварыстве адукацыі. Гэтага ж кірунку прытрымліваліся і бібліятэкі-чытальні ў «народных дамах», пабудаваных у вёсках і мястэчках на грамадскія грошы [3, с. 85–95].

Але ўжо з 20-х гг. XX ст. пачынаецца злосная культурная інквізіцыя. У цыркулярах, падпісаных Н. К. Крупскай, пад забаронай аказалася творчасць Булгакава, Платонава, Ахматавай, Гумілёва, Цвятаевай, Валошына. Забаронена чытанне С. Ясеніна («носьбіт рэлігійна-патрыярхальнай у спалучэнні з вулічнай псіхалогіяй»), Ф. Дастаеўскага («носьбіт шкодных махровакансерватыўных поглядаў, схільнасць да стварэння паталагічных вобразаў»), А. Фета («махровы прыгоннік, якога не любіў Ленін»). Кнігі аўтараў былі выкрэслены з фондаў бібліятэк і выведзены з чытацкага ўжытку [4].

У Беларусі палітыка забароны і знішчэння «непатрэбных» кніжак здзяйснялася сістэматычна і паслядоўна. Гэтаму садзейнічалі рэзалюцыі Усебеларускага сходу загадчыкаў акруговых палітасвет (1926), Усебеларускай клубнай нарады па пытаннях бібліятэчнай работы (1930), у якіх катэгарычна вызначалася адказнасць бібліятэкараў за «ачыстку» бібліятэк ад «непатрэбнай і варожай літаратуры».

Падчас сталінскіх рэпрэсій бібліятэкі былі пазбаўлены твораў ста дваццаці васьмі пісьменнікаў, у тым ліку Ц. Гартнага, М. Гарэцкага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М. Зарыцкага, А. Мрыя, П. Галавача, А. Вольнага, В. Коваля і мн. інш. Некаторыя з іх засталіся толькі ў спецсховішчах трох бібліятэк (Нацыянальнай, Прэзідэнцкай, Акадэмічнай).

Для фондаў бібліятэк згубным аказаўся загад Галоўліта БССР пад № 33 (1937) «Спіс літаратуры, якая падлягае канфіскацыі з бібліятэк, грамадскага карыстання, навучальных устаноў і кнігагандлю». Спіс заняў сто адзінаццаць старонак і ўключаў кнігі Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, тэрміналагічныя слоўнікі, даведнікі, граматыкі, чытанкі, падручнікі, навучальныя дапаможнікі, мовазнаўчыя працы. «Шкодныя» кнігі былі знішчаны, выключаны з каталогаў і картатэк бібліятэк, а разам з імі – і цэлы пласт нацыянальнай культуры Беларусі.

Загад захоўваў сілу дзесяцігоддзямі, толькі змяняючы і ўдакладняючы лексіку. Замест слова «канфіскацыя» сталі ўжываць «ачыстка». У 1954 г. «ачышчалі» бібліятэкі ад палітычна шкоднай літаратуры, у 1961 г. – ад твораў з’ехаўшых за мяжу «здраднікаў і дэкадэнтаў».

Такім чынам, ідэалагічны ці выхаваўчы бар’ер даступнасці інфармацыі на працягу ўсёй гісторыі з’яўляўся адным з галоўных перашкод на шляху кнігі да чытача.

Доступ да інфармацыі набывае яшчэ шмат розных аспектаў, аналіз якіх дае магчымасць выяўляць прычыны перашкод і шляхі іх пераадолення. Звернемся да Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы, у якім тэрмін «даступны» трактуецца наступным чынам:

– такі, да якога можна прайсці або праехаць;
– такі, які падыходзіць для ўсіх або многіх;
– адкрыты для зроку, для назірання;
– лёгкі для разумення;
– уважлівы да іншых, не ганарысты [5, с. 171].

Па сутнасці, у слоўніку выяўляюцца асноўныя аспекты даступнасці: фізічны, сацыяльны, псіхалагічны, камунікатыўны.

У апошні час фізічна даступнымі бібліятэчныя фонды сталі дзякуючы павелічэнню ролі арыентуючай інфармацыі (метаінфармацыі) – аб’явы, схемы, паказчыкі, мнеманічныя знакі розных службаў. Камп’ютарныя тэхналогіі прапануюць шырокі спектр метаінфармацыйных сродкаў: каляровыя вокны, меню, кнопкі з выявай прадметаў-сімвалаў дзеянняў, якія выкарыстоўваюць прынцып мнемонікі, і інш. Рэаліяй стала павелічэнне долі віртуальных рэсурсаў у даведачна-пошукавым апараце:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

электронныя каталогі, базы даных, бібліяграфічныя паказальнікі на дыскетах, кампакт-дысках.

Фізічнай даступнасці інфармацыі спрыяюць і зручнае абсталяванне, сродкі запісу аўдыя- і відэаінфармацыі на машыначытальныя носьбіты, розная аргтэхніка, адпавядаючая сучасным патрабаванням эрганомікі бібліятэчная мэбля.

Актуальным застаецца сацыяльны аспект даступнасці інфармацыі. Многія бібліятэкі па матэрыяльных прычынах не могуць выкарыстоўваць Інтэрнэт, вымушаны прадастаўляць платныя паслугі, змяншаць маштабы міжбібліятэчнага абанемента. Да таго ж існуе кантынгент сацыяльна неабароненых груп насельніцтва. Бібліятэкары разумеюць, што свабодны доступ да інфармацыі садзейнічае адаптацыі ў грамадстве гэтых груп, выраўноўвае інфармацыйна-культурны патэнцыял.

Прычынай недаступнасці інфармацыі можа стаць псіхалагічны бар’ер: некарэктнасць супрацоўніка, адсутнасць дыялогу з карыстальнікам, а часам некампетэнтнасць бібліятэкара. Псіхалагічную напружанасць могуць выклікаць і інтэр’ер, колер, адзенне, знешні выгляд супрацоўніка.

Найбольш частай перашкодай доступу карыстальнікаў да інфармацыі з’яўляецца арганізацыйна-тэхналагічны бар’ер: невыкананне запытаў, звязанае як з аб’ектыўнымі праблемамі пошуку інфармацыі (нават пры выкарыстанні новых інфармацыйных тэхналогій), так часам і нізкай кваліфікацыяй персаналу.

Ёсць сэнс звярнуць увагу і на прававы бар’ер доступу, звязаны з нявырашанасцю некаторых юрыдычных праблем інфармацыйнай дзейнасці.

Толькі ў адкрытым грамадстве, якое прызнае свабоду слова, інфармацыі і здольнае пераасэнсоўваць свае погляды, здзяйсняць пошук раўнавагі паміж традыцыямі і патрэбамі часу, ёсць перспектыва ў будучыні. У такім грамадстве найбольш паспяховым бачыцца выкананне непасрэдна сваіх функцый усімі інфармацыйнымі ўстановамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Баренбаум, И. Е.* Всеобщая история книги / И. Е. Баренбаум, И. А. Шамракова // Современное библиотечно-информационное образование : учеб. тетради. – СПб. : Гос. акад. культуры, 1996. – Вып. 1 .– 127 с.

2. *Дворкина, М. Я.* Информационное обслуживание : социокультурный подход / М. Я. Дворкина. – М. : Профиздат, 2001. – 108 с.

3. *Дзямешка, Л. А.* Культурна-асветніцкая і адукацыйная дзейнасць бібліятэк Беларусі ў гістарычным аспекце / Л. А. Дзямешка // Научные труды

Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. ст. : в 2 ч. / под ред. В. Ф. Беркова. – Минск : РИВШ, 2008. – Ч. 2, вып. 6 (11). – С. 85–95.
4. *Крупская, Н. К.* Укрепим библиотечное дело / Н. К. Крупская. – М. : [Б.и.], 1929. – 48 с.
5. *Тлумачальны* слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя, 1996. – 889 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ